᠎# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 9 (29) Красавік 2016***

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*

## Выратуй і памілуй нас, чорны бусел…

***Калі ж і зараз ты не загукаеш,***
***А будзеш жыць пад страхам і прынукай,***
***Чарнобыль не такі яшчэ чакае***
***Тваю зямлю, тваіх дзяцей і ўнукаў.***

***С. Законнікаў***



На кожнага жыхара Зямлі прыходзіцца больш за 20 тон у год прамысловых і іншых адходаў. У атмасферу штогод трапляе больш за 200 млн. тон забруджвальнікаў, асабліва шкодных для людзей. У выніку пагоршыўся стан навакольнага асяроддзя. Асноўнымі напрамкамі пагаршэння якасці навакольнага асяроддзя з'яўляюцца:

***1. Парніковы эфект.*** Дзейнасць людзей парушае прыродную раўнавагу ў атмасферы. У выніку значныя плошчы на Зямлі будуць затопленыя.

***2. Разбурэнне азонавага пласта*** - прычынай гэтага з'яўляецца гаспадарчая дзейнасць чалавека і прыродныя цыклы.

***3. Знішчэнне лясоў.*** Лясы – гэта «лёгкія планеты», яны забяспечваюць Зямлю кіслародам. Наша планета губляе лясное покрыва практычна ва ўсіх рэгіёнах свету



***4. Дэфіцыт прэсных вод.*** Штогод у вадаёмы трапляе велізарная колькасць неачышчаных сцёкавых вод.

***5. Вялікую небяспеку нясуць чалавецтву прамысловыя аварыі.*** У красавіку 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС адбылася найбуйнейшая глабальная экалагічная катастрофа тэхнагеннага паходжання.

***6. І яшчэ на экалогію ўплываюць глабальныя праблемы чалавецтва.***

Адно з двух: або людзі зробяць так, што ў паветры стане меней дыму, або дым зробіць так, што на Зямлі стане меней людзей…

# Аварыя на Чарнобыльскай АЭС: праз 30 гадоў




Чарнобыльская катастрофа — разбурэнне 26 красавіка 1986 г. чацвёртага энергаблока Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, размешчанай на тэрыторыі Украінскай ССР (цяпер — Украіна). Разбурэнне насіла выбухны характар, рэактар быў цалкам разбураны, і ў навакольнае асяроддзе была выкінута вялікая колькасць радыеактыўных рэчываў. Аварыя расцэньваецца як найбуйнейшая ў сваім родзе за ўсю гісторыю атамнай энергетыкі, як па колькасці загінуўшых і пацярпелых ад яе наступстваў людзей, так і па эканамічным “пашкоджанні”. На працягу першых трох месяцаў пасля аварыі загінуў 31 чалавек; аддаленыя наступствы апрамянення, выяўленыя за наступныя 15 гадоў, сталі прычынай гібелі ад 60 да 80 чалавек. 134 чалавека перанеслі прамянёвую хваробу той ці іншай ступені цяжкасці.






У адрозненне ад бамбардзіровак Хірасімы і Нагасакі, выбух нагадваў вельмі магутную «брудную бомбу» — асноўным фактарам паражэння стала радыеактыўнае заражэнне.



Воблака, якое ўтварылася ад палаючага рэактара, разнесла розныя радыеактыўныя матэрыялы, і перш за ўсё радыенукліды ёду і цэзію, па большай частцы тэрыторыі Еўропы

Чарнобыльская аварыя стала падзеяй вялікага грамадска-палітычнага значэння для СССР.



Да часу аварыі на ЧАЭС дзейнічалі чатыры энергаблока на базе рэактараў РВМК-1000 (рэактар вялікай магутнасці канальнога тыпу) з электрычнай магутнасцю 1000 МВт (цеплавая магутнасць — 3200 МВт) кожны. Яшчэ два аналагічных энергаблока будаваліся. ЧАЭС выпрацоўвала прыкладна дзясятую долю электраэнергіі УССР.

ЧАЭС спынена назаўсёды 15 снежня 2000 г.

# Нястомны працаўнік навукі



**ЭМАНУІЛ РЫГОРАВІЧ ІОФЕ**
**Выпускнік 1956 года**
**Доктар гістарычных навук (1993), прафесар (1995).**
**Даследчык беларускай гістарыяграфіі, гісторыі навукі і культуры, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, гісторыі беларускіх яўрэяў.**
**Ганаровы сябра Беларускай асацыяцыі палітычных навук. Член Саюза журналістаў.**

Нарадзіўся 20 сакавіка 1939 г. ў горадзе Беразіно Мінскай вобласці.

У пачатку ВАВ сям'я Іофе эвакуіравалася ў Казахстан. У 1941-1942 гг. каля 20 сваякоў Эмануіла Іофе, што засталіся ў Беларусі, загінулі падчас Халакосту. Вясной 1945 г. сям'я Іофе вярнулася з Казахстана ў Беразіно.

У 1946 г. Эмануіл паступіў у СШ № 2 горадзе Беразіно, якую скончыў з дзвюма чацвёркамі і астатнімі пяцёркамі ў атэстаце. Паступіў на першы курс гістарычнага факультэта БДУ.

У 1969 г. паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. У 1975 годзе Іофе абараніў кандыдацкую дысертацыю, а з 30 жніўня 1978 г. стаў працаваць у МПІ імя М. Горкага (цяпер – БДПУ імя Максіма Танка).

У 1983 г. ён стаў дацэнтам. У 1993 г. Эмануіл Іофе абараняе доктарскую дысертацыю і працуе прафесарам кафедры паліталогіі і права БДПУ.

Пасля абароны доктарскай дысертацыі Эмануіл Іофе вырашыў удасканаліць сваю адукацыю і атрымаў яшчэ два дыплома.

У 1995 г. Вышэйшая атэстацыйная камісія Беларусі прысвоіла яму Навуковае званне «прафесар».

**Навуковая праца**

1990 г. - манаграфія «З гісторыі беларускай вёскі (Савецкая гістарыяграфія сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі сярэдзіны XVII - першай паловы XIX ст.)».

1978-1991 гг. - навуковыя артыкулы пра жыццё і дзейнасць некаторых вядомых прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры, у прыватнасці, Я. Коласа, С. М. Некрашэвіча і В. М. Ігнатоўскага.

1988г. - кніга «Савецкія военачальнікі на беларускай зямлі. Даведнік па месцах жыцця і дзейнасці».

*(Заканчэнне на 4 старонцы)*

(Заканчэнне. Пачатак на 3 старонцы)




1993 г. - абарона доктарскай дысертацыі на тэму «Савецкая гістарыяграфія сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі ў сярэдзіне XVII - першай палове XIX стагоддзя».

З 1996 г. ён апублікаваў шэраг прац па гісторыі беларускіх яўрэяў. Самыя вядомыя - «Беларускія яўрэі ў Ізраілі» (2000) і кніга «Нобелеўскія лаўрэаты з беларускімі каранямі» (2008).

2003 г. - галоўная праца Іофе па тэме генацыду беларускіх яўрэяў у гады ВАВ - манаграфія “Беларускія яўрэі: трагедыя і гераізм. 1941-1945”. Аўтар упершыню глыбока адбіў тэму ўдзелу яўрэяў у антыфашысцкім падполлі ў беларускіх гарадах.




Акрамя яўрэйскай тэматыкі, Іофе заняўся таксама маладаследаванымі сюжэтамі перыяду ВАВ.

Асобнай тэмай даследаванняў Іофе стаў аналіз жыцця і дзейнасці кіраўнікоў БССР. Вынікам гэтай навуковай працы стала кніга «Ад Мяснікова да Малафеева. Хто кіраваў БССР», якая выйшла ў 2008 г.

## Выкладчыцкая дзейнасць




У рамках работы прафесарам кафедры паліталогіі і права БДПУ імя Максіма Танка Эмануіл Іофе вёў маштабную выкладчыцкую працу. Ён быў адным з першых лектараў, якія перайшлі на беларускую мову выкладання паліталогіі, распрацаваў цэлы шэраг новых лекцый і спецкурсаў. Студэнты называюць Іофе «майстрам дыскусіі» за яго метадалогію правядзення семінараў.

## Найважнейшыя навуковыя дасягненні

На думку аўтараў кнігі «Э. Р. Іофе. Партрэт вучонага і педагога», ключавыя навуковыя даследаванні Іофе зробленыя ў галіне яўрэйскай гісторыі, маладаследаваных і недаследаваных аспектах ВАВ і аналізе жыцця і дзейнасці шэрагу кіраўнікоў БССР. Ён лічыцца адным з вядучых у Беларусі спецыялістаў па гісторыі Халакоста.



*Імя беларускага вучонага, гісторыка, палітолага, сацыёлага, культуролага і педагога добра вядома не толькі на Беларусі, але і за яе межамі. Доктар гістарычных навук, прафесар Э. Іофе ўнёс значны ўклад у развіццё грамадскіх навук і адукацыйнай сістэмы ў рэспубліцы. Ён аўтар 780 навуковых прац, у тым ліку 46 кніг і брашур. Большасць з іх выйшла на беларускай і рускай, некаторыя – на англійскай, нямецкай, польскай, украінскай і іншых мовах. Шматгадовая плённая праца вучонага адзначана шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.*

# Дуэт-лідар - 2016

## Піянерыя была ўчора, ёсць сёння і будзе заўтра…



*Даведка: у конкурсе «Дуэт-лідар» выступаюць адзін вучань — лідар якой-небудзь арганізацыі, часцей за ўсё піянерскай, і адзін дарослы прадстаўнік той жа школы — настаўнік, педагог-арганізатар, піянерважаты. «Дуэт» павінен прадэманстраваць які-небудзь накірунак сваёй грамадскай працы. Пры гэтым настаўнік і вучань паказваюць зладжанасць свайго дуэта і тое, што кожны з іх можа называцца лідарам у той школе, дзе працуе або вучыцца.*

У 2016 г. амаль усе дуэты прадстаўлялі працу школьных піянерскіх арганізацый. Выступленне складалася з розных заданняў. Настаўнікі ў многіх дуэтах былі настолькі маладыя, што гледачы спачатку задумваліся, хто ёсць хто. Не дзіўна, бо маладыя спецыялісты яшчэ ўчора самі сядзелі за партай! Але, нягледзячы на маладосць, такія дуэты выглядалі ані не горш больш дарослых і дасведчаных удзельнікаў.

Лідар нашай школы - Лізавета Вайцяховіч – нам даўно знаёмая, бо многія чытачы памятаюць, што яна з'яўляецца актыўным юным карэспандэнтам школьнай газеты.

У «Візітоўцы» ўдзельнікі стараліся як мага цікавей і арыгінальней расказаць пра сябе.

Праекты розных дуэтаў склалі своеасаблівую «вясёлку» — чаго тут толькі не было! І валанцёрская праца, і ўборка прыродных ландшафтаў, і свята для мам, і здаровы лад жыцця! Паводле аднаго гэтага пераліку можна меркаваць, якая разнастайная грамадская праца вядзецца ў школах лідарскіх дуэтаў.



На жаль, у школах па-ранейшаму не хапае мужчын. Таму ўсе дарослыя лідары былі жанчыны. Ды і лідараў-хлапчукоў набралася ўсяго двое.

У выніку журы сказала: «Тых, хто прайграў, няма!!! Вы ўсе нас пакарылі!!!»

*Надзея Міхалёва*





# Усё толькі пачынаецца ...




*“Усё толькі пачынаецца, -*
*сказаў спадарожны вецер. -*
*Усё толькі пачынаецца,*
*І будзе свет твой светлы!”*

23 кастрычніка прайшоў раённы конкурс "Зорачкі надзей". Вучні нашай школы гэтак жа прымалі ўдзел у ім. Гэта магчымасць паказаць сябе на вялікай сцэне перад велізарнай залай. Дзеці спявалі, танцавалі, чыталі вершы... Хто што ўмеў, тое і паказаў на сцэне.

І вядома ж, усе яны пераможцы, але хтосьці трошкі лепш, хтосьці трошкі горш. Адна з нашых вучаніц атрымала гран-пры. Несцяровіч Соф'я (вучаніца 1 "А" класа) спявала песню "Родная песенка".

І падумайце: яна яшчэ толькі ў 1 класе, а ўжо такія перамогі.

Падрыхтавацца да конкурсу ёй дапамагла Тамара Іосіфаўна. Самой Соф'і вельмі спадабалася на сцэне, яна хоча яшчэ і яшчэ пабываць на ёй і адчуць тыя радасныя эмоцыі, як і ў першы раз. Спадзяёмся, што гэта яе не апошні выхад на сцэну, і не апошняя перамога. Давайце пажадаем ёй поспеху!

*Лізавета Вайцяховіч*












# «Зубрёнок»…
# Солнечный город…
# Команда ЮИД СШ № 2 г. Березино «Пристегнись»…

*С 26 по 29 апреля 2016 года в рамках проведения профильной смены «Маршрутами безопасности» в УО «Национальный детский образовательно-оздоровительный центр «Зубренок» состоялся 44-й Минский областной слет отрядов юных инспекторов движения среди 23 команд-победительниц районных соревнований.*

*Юные инспекторы движения прошли испытания в восьми конкурсах: «Теоретический экзамен на знание ПДД», «Внимательный участник дорожного движения», «Агитационно-художественное представление», «Мой отряд», «Оказание первой помощи пострадавшим», «Вождение велосипеда в условиях, аналогичных реальному дорожному движению», «Газета» и «Фигурное вождение велосипеда».*











Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 29, красавік 2016 г.















ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Галуза Яўгенія, Цэнкель Алена, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына